**План урока беларускай мовы,**
**праведзены ў 7 «А» класе**
**Настаўніца Губар А.П.**
**Тэма: Лады дзеяслова: абвесны, загадны, умоўны**

**Мэта:**
- ✓ стварыць умовы для фарміравання паняцця пра лады дзеяслова, выпрацоўваць уменні вызначаць лад дзеяслова, вучыць правільна ўжываць формы ладу дзеясловаў у маўленні;
- ✓ развіваць мысленне, памяць, мову вучняў;
- ✓ спрыяць выхаванню жадання берагчы і ахоўваць прыроду.

**Тып:** урок вывучэння новага матэрыялу.
**Дыдактычнае забеспячэнне:** карткі з заданнямі, схемы, табліцы, раздатачны матэрыял.
**Эпіграф:**
*Сэнс жыцця нашага – бесперапынны рух.*
***Якуб Колас***

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант.**

Добры дзень! Вось і зноў мы сустрэліся з вамі, каб працягваць разам крочыць па краіне Мовазнаўства, узбагачацца новымі ведамі, рабіць вялікія і малыя адкрыцці для сябе. Калісьці класік беларускай літаратуры Якуб Колас выразіў думку, што «сэнс жыцця нашага –бесперапынны рух».
- ✓ **А вы згодны з такім меркаваннем?**
- ✓ **Скажыце, вам падабаецца падарожнічаць?**
- ✓ **А ў якіх мясцінах Беларусі вы ўжо пабывалі?** (Адказы вучняў).
- ✓ **А дзе падчас падарожжаў вы маглі б убачыць такія краявіды?** (Вучні выказваюць меркаванні, дэманстрацыя слайда).







**II. Праверка дамашняга задання**

**2.1.Праверка практыкавання 80.** Вучні зачытваюць сказы, тлумачаць правапіс суфіксаў дзеяслова, правапіс прапушчаных літар.

**2.2. Дыферэнцыраванае заданне.**

Сфармулюйце правілы правапісу дзеясловаў з суфіксамі -ава- (-ява-), -ва-, -ыва-, (-іва), абапіраючыся на схемы вучэбнага дапаможніка с. 49. Выкананне практыкавання 77 па варыянтах. (узаемаправерка).

**III. Актуалізацыя ведаў, мэтавызначэнне.**

На працягу апошніх урокаў мы з вамі вывучаем дзеяслоў. У вас на партах ляжаць схемы. Запоўніце адкрытую схему, узгадаўшы граматычныя катэгорыі ўласцівыя дзеяслову (Раздатачны матэрыял. Работа ў парах. (Адказы вучняў).

***<u>Граматычныя катэгорыі дзеяслова</u>***




**IV. Паведамленне тэмы і мэтавызначэнне.**

Сёння на ўроку мы пазнаёмімся яшчэ з адной граматычнай катэгорыяй дзеяслова. А вось што гэта за катэгорыя, вы зараз здагадаецеся. Адкажыце на пытанні:

- ✓ **Падумайце, як гавораць, калі ў доме парадак і згода, усе справы ладзяцца?**
- ✓ **А ў музычнай грамаце якімі словамі характарызуецца настрой музыкі?** (сумны ці вясёлы).

Так, гэта слова – ***ЛАД***. У граматыцы таксама прысутнічае гэтае слова.

**Звярніце ўвагу на тэму ўрока, якая запісана на дошцы. (Вучні звяртаюцца да тэмы ўрока, фармулююць разам з настаўнікам задачы на ўрок. Прыём «Працягні фразу»).**

- ✓ Сёння на ўроку я хачу даведацца, што такое лад дзеяслова.
- ✓ На сённяшнім уроку я хачу навучыцца вызначаць дзеясловы розных ладоў у тэксце.
- ✓ На ўроку я буду вучыцца правільна ўжываць дзеясловы розных ладоў ва ўласным маўленні.

**V. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**5.1. Слова настаўніка.**

У залежнасці ад таго, рэальнае ці нерэальнае дзеянне абазначае дзеяслоў, **выдзяляюць 3 лады дзеясловаў: абвесны, умоўны, загадны.** У чым адметнасць кожнага з гэтых ладоў, адкрыеце для сябе самі.

**5.2. Запоўніце табліцу, падрыхтуйце вуснае выказванне па тэме. Раздатачны матэрыял карткі з тэкстам «Беражыце прыроду».**

(Вучні працуюць у парах, запаўняюць табліцу, складаюць вуснае выказванне, абапіраючыся на матэрыял табліцы).

**Беражыце прыроду**

Уся прырода і самая маленькая яе частка: дрэва ў скверы, рамонкавая паляна сярод дамоў новага мікрараёна – усё гэта належыць чалавеку. Чалавек, як кажуць, з’яўляецца гаспадаром прыроды, цудоўнай натуральнай аздобай зямлі. Калі мы гаспадары, то і абаронцы. Бо нельга, згадзіцеся, толькі валодаць, не плаціць за дабрыню дабрынёй. Бяздумна спілаваць таполю, знішчыць сад, прынесці з прагулкі вялізны букет лясных або палявых кветак, вылавіць рыбны маладняк у рачулцы – усё гэта прыносіць шкоду навакольнаму асяроддзю, змяншае прыродныя багацці. А яны, на жаль, далёка не бязмежныя. У вялікіх гарадах і побач з імі гэта праблема стаіць, як вядома, надзвычай востра.

Ніякімі дэкрэтамі і законамі, дарагія сябры, не абмежаваць прыроду ад знішчэння, калі кожны з нас не ўсвядоміць простай ісціны. Робячы шкоду навакольнаму асяроддзю, мы шкодзім найперш самім сабе.

| | | |
|---|---|---|
| **Дзеясловы абвеснага ладу** | | |
| **Абазначаюць** | | |
| **Маюць** | | |
| **Змяняюцца** | у цяп. і буд. часе | у прошл. часе |
| **Дзеясловы умоўнага ладу** | | |
| **Абазначаюць** | | |
| **Утвараюцца** | дзеяслоў _____і часціца _______ (пасля_______________)<br>дзеяслоў ____________ і часціца _____(пасля_______________) | |
| **Змяняюцца** | | |
| **Дзеясловы загаднага ладу** | | |
| **Выражаюць** | | |
| **Маюць формы** | | |
| **Утвараюцца** | 2 асоба адз. ліку<br>пры дапамозе _______________ | |
| | 2 асоба множн. ліку:<br>пры дапамозе _________________________ | |

**5.3. Выкананне практыкавання 86.**

***Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Падкрэсліце зваротныя дзеясловы. Вызначце, у якім ладзе яны ўжыты. Як адным словам пабеларуску называюцца цёплыя краі, куды адлятаюць на зіму пералётныя птушкі?***

Добра ра(н/нн)яй в..сной у с..сновым лес..! Вось прагучаў сярод з..лёнай ігліцы звонкі спеў. Спыніцеся і прыслухайце - ся. Пады..дзіце да дрэва, адкуль чуецца меладычная песен..ка. Прыгледзьцеся — і вы ўбачыце птушачку з гру(д/т)кай цёмна(?)ц..глянагам колер.., з белымі палоскамі на крылах. Гэта берасцянка, якая в..рнулася да нас з цёплых краёў у пачатку красавіка. Пад дрэвамі трымаюцца яшчэ апошні.. рэшткі снег.., а яна сп..вае с..бе ў захапле(н/нн)і.

(Паводле В. Вольскага).

**5.4. Работа з тэкстам па выяўленні дзеясловаў пэўнага ладу (Раздатачны матэрыял).**

- ✓ **Вызначце стыль тэксту.**
- ✓ **Пракаменціруйце арфаграмы, якія сустрэліся ў тэксце.**

Сябры, калі б вы мелі ма..чымасць часта «жыць на колах», шмат хадзілі б і падарожнічалі, вы б убачылі многае ў свеце. Але перш за ўсё пазнайце свой край. Збірайцеся і едзьце з экскурсіямі або проста да сваякоў і сяброў. І вы ўбачыце ўсе канцы нашай мілай, ласкавай краіны, якая зачаруе вас сваёй няўлоўнай прыгажосцю. Слухайце музыку нашай п..вучай мовы, нашы пя..чотныя песні, і тады вы пазнаеце свой гасцінны, добры і тал..навіты народ, пачуеце дыханне сваёй роднай з..млі. **(Вучні чытаюць сказы, вызначаюць лады дзеясловаў, тлумачаць арфаграмы)**

***Фізкультхвілінка***

**VI. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**6.1. Прачытайце тэкст. Раскрыйце дужкі, пастаўце дзеясловы ў форму патрэбнага ладу. Раздатачны матэрыял. (Вучні працуюць з тэкстамі. Праверка выканання).**

І. Мы (заходзіць) у хату. Ля ўвахода, справа, (размяшчацца) мыцельнік – месца для посуду і кухонных рэчаў, злева - печ. За печчу стаяць лава. У былыя часы на ёй (сядзець), а ноччу нават (спаць), асабліва калі (прыязджаць) госці. Перад лавай у куце традыцыйна (размяшчацца) стол. Уздож сцен (стаяць) куфры – скрыні для захоўвання адзення.

ІІ. Калі … вы (зайсці) ў хату яшчэ некалькі дзясяткаў гадоў назад, то вы (ўбачыць) …, як яна выглядала раней. Вы абавязкова (звярнуць) … ўвагу, што справа размяшчаўся мыцельнік – месца для посуду і кухонных рэчаў, злева стаяла печ. За печчу - лава. У былыя часы на ёй сядзелі, а калі … (прыехаць) шмат гасцей, то можна (быць) … пакласці на яе каго-небудзь спаць.

**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

- ✓ Якую граматычную катэгорыю дзеяслова мы сёння вывучалі на ўроку?

- ✓ Якое заданне падалося самым цікавым?
- ✓ Якое заданне падалося самым складаным?
- ✓ Якія незвычайныя мясціны Беларусі вы хацелі б наведаць?

**VIII. Дамашняе заданне.**

§15, пр. 84.